■ Далёкае — блізкае

# ПА СТАРЫМ АБРАДЗЕ

## Чаму іканапісцы не пазначалі аўтарства на абразах?

**Адказы на гэтае і іншыя пытанні ўсе зацікаўленыя атрымаюць, наведаўшы выставу ў Гродзенскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі, якая паказвае стараверскія абразы XIX — пачатку XX стагоддзя ў Беларусі.**

### Стараста прыходу плакаў...

Большасць абразоў, прадстаўленых на выставе, паходзіць са стараверскай Свята-Троіцкай царквы, што знаходзіцца ў ўрочышчы Стрыпішкі на Астравеччыне. Гістарычна гэта Дзісненскі цэнтр іканапісання.

— Абшчына старавераўпапоўцаў існавала ў Стрыпішках з XVIII стагоддзя, — кажа аўтар канцэпцыі выставы, вядучы навуковы супрацоўнік Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі Людміла РУСЕЦКАЯ. — Прыкладна тады ж магла быць узведзена і царква. Яна неадночы аднаўлялася, апошняя рэканструкцыя адбылася ў 1910 годзе. Аднак мяжа, якая ў пачатку 1990-х паўстала паміж незалежнымі Літвой і Беларуссю, аддзяліла ад храма амаль 90% прыхаджан. Царква засталася без прыхаджан, а прыхаджане без царквы.


Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Вядучы навуковы супрацоўнік Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі Людміла РУСЕЦКАЯ і мастак-рэстаўратар Уладзімір КІСЛЫ шмат ведаюць пра стараверскія абразы.

Зрэшты, храм спыніў сваю дзейнасць яшчэ раней. У пачатку 1980-х, калі ён быў зняты з рэгістрацыі, былы галоўны захавальнік фондаў музея Ніна ЛЯШЧОНАК прыязджала ў Стрыпішкі ў складзе экспедыцыі.

— Нам афіцыйна, па актах, бязвыплатна перадалі абразы, а таксама спеўнік стрыпішкаўскай стараверскай суполкі, — прыгадвае Ніна Іванаўна. — Стараста прыхода плакаў, а я, спрабуючы яго супакоіць, прасіла не хвалявацца. Маўляў, мы ўсё захаваем і, можа, вашы каштоўнасці вернуцца ў Стрыпішкі...

Сярод стараверскіх абразоў былі распаўсюджаны творы, якія аб'ядноўвалі элементы жывапісу і меднай пластыкі. За абразамі і літымі ўрэзкамі замацавалася назва «дамавы іканастас». У цэнтры іх абавязкова размешчаны крыж, а вакол яго — літыя абразкі і шматстворкавыя складні. Пасля ўказаў Пятра I «Аб забароне ўжывць у царкоўных і прыватных дамах разныя і адліўныя іконы» (1722) і Свяшчэннага Сінода аб забароне вырабу і продажу літых абразоў (1723) гэтую сферу афіцыйна прызналі нелегальнай. Аднак старавеы ігнаравалі забароны і таму сталі манапалістамі ў гэтай галіне мастацтва.

Адным з найважнейшых разыходжанняў паміж стараверамі і ніканіянамі было пытанне аб складанні пальцаў. Афіцыйная царква забараняла выяву двухперстя на абразах, а ў стараверскім мастацтве яно сустракаецца паўсюдна.

Разыходзіліся старавеы з ніканіянамі і ў напісанні абрэвіятуры імені Хрыста. Старавеы адмаўляюць напісанне «Ісус» (два і) і, значыць, надпіс на абразах «ІИ. ХС». Правільным, на іх думку, з'яўляецца напісанне імені Хрыста як Ісус і абрэвіятуры «ІС. ХС».

Акрамя таго, стараверскія іканапісцы працягвалі старажытную рускую традыцыю пісаць евангелістаў у выглядзе жывёл, што было катэгарычна забаронена Праваслаўнай Царквой у 1722 годзе.

### Гістарычная даведка

Стараверства («древлеправославие») — сукупнасць рэлігійных плыняў і арганізацый, якія не прызналі праведзеную ў 1650—1660 гадах патрыярхам Ніканам і царом Аляксеем Міхайлавічам царкоўную рэформу, мэтай якой была ўніфікацыя богаслужэбнага чыну Рускай Праваслаўнай царквы з грэчаскай і перадусім Канстанцінопальскай Царквой. Прыхільнікаў стараверства, за выключэннем адзінаверцаў, называлі «раскольнікамі» да прыняцця ўказа «Об умацаванні асноў верацярпімасці» 17 красавіка 1905 года, які скасоўваў заканадаўчыя абмежаванні ў дачыненні да стараверцаў.

На працягу стагоддзяў прыхільнікі старога абраду пераследаваліся і былі гнаныя. У пошуках лепшага жыцця яны ішлі за межы Расіі, у тым ліку на землі Рэчы Паспалітай. Старавеы заснавалі на беларускіх землях два буйныя цэнтры — вакол Браслава і Відзаў (Падзвінне) і Веткі (Палессе). У гэтых рэгіёнах фарміраваліся самабытныя асаблівасці іканапісу. На памежнай з Літвой тэрыторыі развіваўся цэнтр іканапісу, названы ўмоўна даследчыкамі «Дзісненскі». Гэты рэгіён гістарычна ўваходзіў у склад ВКЛ, а пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай стаў часткай Віленскай губерні. Дзісненскі цэнтр існаваў прыблізна з 1830-х па 1920-я гады. Працягам і развіццём яго стаў Віленскі цэнтр.

### Сумленна і сціпла

Абразы са Стрыпішак рыхтаваў да выставы мастак-рэстаўратар Уладзімір КІСЛЫ. Прафесіянал са шматгадовым вопытам высока ацэньвае майстэрства стараверскіх іканапісцаў:

— Яны ўсё рабілі строга па каноне. Спачатку падрыхтоўвалі дошку, потым накладвалі шматслаёвы ляўкас — грунт... Працавалі настолькі сумленна!

Праўда, умовы захавання абразоў не заўжды былі належнымі. Пакост вельмі моцна пацямнеў, на яго наліпла шмат пылу, грунт ад перападу тэмпературы паўспучваўся. Уладзімір Кіслы прасвідроўваў малюсенькія адтуліны, шпрыцом уводзіў пад пухір спецыяльны палімер і пад прэсам укладваў яго назад.

Ці ёсць на абразах звесткі пра іх аўтараў?

— Подпісы можна знайсці на абразах несакральных, а на рэлігійных, і асабліва стараверскіх, гэта вялікая рэдкасць, — расказвае Уладзімір Кіслы. — Бо калі мастак малюваў абраз, то лічылася, што ён гэта робіць для Бога, а Бог і так бачыць усё. І падпісаць абраз — гэта вельмі нясціпла, нават абуральна. Праўда, калі майстру ўжо так карцела, то ён дзесьці пазначаў сваё аўтарства. Але пры гэтым ганьбіў сябе — «недостойного и унылого раба Божьего».

Дарэчы, падобная гісторыя здарылася і з самім Уладзімірам Кіслым. У 1980-я гады знаёмыя прывезлі яму звон з разбуранай царквы. Казалі, што праз пэўны час забяруць, але мінула гадоў 10, а звон так і застаўся ў мастака. Прыватныя асобы прапаноўвалі прадаць яго, але штосьці Уладзіміра стрымлівала.

— Урэшце я перадаў гэты звон славутай Маламажэйкаўскай царкве абарончага тыпу ў вёсцы Мураванка Шчучынскага раёна, — расказвае Уладзімір Кіслы. — Папрасіў у айца Анатоля Нявобава, які ў той час там служыў, распіску, што я не прадаў звон, а перадаў царкве. Але перад гэтым... Узяў бормашыну і маленькім гравёрам наўскрайку сціпленька выгравіраваў надпіс: «Захаваўшы ў ліхія часы, вярнуў у належнае месца недастойны раб Божы Уладзімір». Мы з айцом Анатолем павесілі гэты звон, пазванілі на ўсю акругу. І мне на душы стала добра ...

**Барыс ПРАКОПЧЫК**
*prakopchik@zviazda.by*



Свята-Троіцкая царква ва ўрочышчы Стрыпішкі Астравецкага раёна.

■ Ініцыятыва

# САМАЯ БЕЛАРУСКАЯ З МАГНАЦКАГА РОДУ

## Прах мецэнаткі Магдалены Радзівіл можа быць перанесены са швейцарскага Фрыбура ў Мінск

**Пра такую задумку падчас нядаўняга візіта ў Беларусь расказалі князі Мацей і Мікалай Радзівілы.**

— Магдалена Радзівіл лічыла сябе беларускай, цягам свайго жыцця яна падтрымлівала беларускія школы, беларускую культуру, палітычныя рухі, якія ў гады Першай сусветнай вайны імкнуліся да незалежнасці краіны. Для яе гэта было няпроста, бо такая пазіцыя не была папулярнай у колах польскай, літоўскай арыстакратыі, якая думала пра ўваскрэсенне Рэчы Паспалітай у выглядзе федэрацыі народаў, што раней жылі ў гэтай дзяржаве. Але Магдалена выхавала сябе беларускай, — кажа Мацей Радзівіл.

Магчыма, цікавасць да беларускай культуры і мовы Магдалене прывіў яе другі муж Мікалай Вацлаў Радзівіл, афіцэр царскай арміі. Ён быў амаль на дваццаць гадоў маладзейшы за жонку, глыбока цікавіўся беларускім фальклорам. На жаль, ён загінуў у пачатку Першай сусветнай вайны.

Пра мецэнацкую дзейнасць Магдалены Радзівіл можна распавядаць шмат. Яна падтрымлівала выдавецкую суполку «Загляне сонца і ў наша



Магдалена Радзівіл (у дзявоцтве Завіша) у маладосці.

аконца», Беларускае выдавецкае таварыства. Дзякуючы яе фінансаваму спрыянню пабачылі свет кнігі Максіма Багдановіча, Канстанцыі Буйло. А прыбытак ад продажу аднаго з самых каштоўных яе брыльянтавых калье — а гэта 15 тысяч долараў (на той час — вельмі вялікія грошы) — быў перададзены кляштару айцоўмарыянаў у Друі.

Лёс склаўся так, што ў 1918 годзе Магдалена Радзівіл вымушана была эміграваць з Беларусі. Жыла ў Польшчы, Літве, Германіі. З 1932 года — у швейцарскім Фрыбуры, дзе і памерла ў 1945 годзе ва ўзросце 83 гадоў.

— Яшчэ жывыя праўнукі Магдалены Радзівіл, якія яе памятаюць. Яны ведаюць пра стаўленне прабабулі да Беларусі, пра яе мару жыць і памерці тут, — распавядае Мацей Радзівіл, — Яна марыла жыць у Мінску, але не мела такой магчымасці. Пакінула тэстамент, але ён не змяшчае інструкцый, дзе Магдалена хацела б быць пахаванай. Варта ўлічваць, што дакумент складаўся ў 1943 годзе, і ў той час ніхто нават не думаў пра магчымасць быць пахаваным у Мінску ці Нясвіжы.

Дарэчы, у Фрыбуры Магдалена мела вельмі добрую сяброўку з Германіі, яны захварэлі амаль у адзін час і марылі быць пахаванымі ў адным склепе. Так і сталася. Сёння прах Магдалены, як дачкі Марыі Красінскай і сяброўкі захоўваецца побач. Радзівілы жадаюць выканаць гэтую волю Магдалены і ў Мінску пахаваць сяброўак таксама разам. А прах дачкі Магдалены можа быць перанесены ў Сіняву (Польшча), дзе знаходзіцца фамільная крыпта, бо сёння ніхто з яе нашчадкаў у Швейцарыі не жыве.

Ёсць верагоднасць, што прах Магдалены Радзівіл будзе перанесены ў Чырвоны касцёл у Мінску, цяпер ідуць перамовы з кіраўніцтвам касцёла Беларусі і гарадскімі ўладамі. І ў гэтым бачыцца досыць лагічнае рашэнне: мецэнатка жыла ў Мінску непадалёк ад касцёла, нават захаваўся яе дом на плошчы Незалежнасці. Таксама Чырвоны касцёл сёння становіцца пантэонам духоўнасці Беларусі: дзесяцігоддзе таму тут быў перазахаваны прах фундатара касцёла Эдварда Вайніловіча, знайшоў апошні спачын у гэтым храме і прах даследчыка беларускай культуры, англійска-французскага адваката Гая Пікарда.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

**Сёлета споўнілася 155 гадоў з дня нараджэння Магдалены Радзівіл. Да гэтай важнай даты была прымеркавана міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Магнаты і шляхта Вялікага Княства Літоўскага — апора беларускай дзяржаўнасці, асветнікі і фундатары беларускай культуры». Форум, арганізаваны Нацыянальным гісторыка-культурным музеем-запаведнікам «Нясвіж» і Прэзідэнцкай бібліятэкай Рэспублікі Беларусь, прайшоў у Мінску і Нясвіжы.**

**Падчас пленарнага і секцыйных пасяджэнняў навукоўцы разважалі пра ролю мецэнацтва ў развіцці культуры Беларусі, гаварылі пра ўнёсак Магдалены Радзівіл, значнасць яе асобы. Але, думаецца, нас яшчэ чакаюць адкрыцці. Нават напрыканцы жыцця Магдалена не адпачывала, займалася дабрачыннасцю. Доктар філалагічных навук Адам Мальдзіс выказаў думку, што ў архівах Фрыбура могуць захоўвацца ўспаміны мецэнаткі, таму варта правесці больш падрабязнае даследаванне. Цалкам верагодна, што ў лёсе Магдалены Радзівіл нам адкрыюцца новыя старонкі.**